# ЦЭНТР СЛАВЯНСКІХ МОЎ І КУЛЬТУР

Культурнае жыццё на філалагічным факультэце віруе штодзень. І ў гэтым немалая заслуга Цэнтра славянскіх моў і культур, створанага па ініцыятыве дэкана філалагічнага факультэта нашага ўніверсітэта С.У. Нікалаенкі ў супрацоўніцтве з Інстытутам неафілалогіі Зеленагурскага ўніверсітэта (Польшча). Цэнтрам актыўна ладзяцца мерапрыемствы, прысвечаныя мове, літаратуры і культуры.

Так, на пачатку кастрычніка па запрашэнні кіраўніка цэнтра Юрыя Міхайлавіча Бабіча да студэнтаў-філолагаў завітаў віцебскі паэт-гумарыст Міхась Мірановіч. Хлопцы і дзяўчаты пачулі пародыі з яго новай кнігі «Перасмешкі» на вершы Ніла Гілевіча, Генадзя Бураўкіна, Уладзіміра Папковіча, Яўгеніі Мальчэўскай і інш. На сустрэчы пісьменнік распавёў пра калектыўную пародыю, а з адносна маладым жанрам антыпародыі прысутных пазнаёміла паэтка, дацэнт кафедры літаратуры нашай ВНУ Вольга Іванаўна Русілка, даўняя знаёмая М. Мірановіча. Яшчэ больш гумару ў літаратурную імпрэзу прыўнеслі пародыі «Даведка», «Каляндар», «Па шпалах», «Чубы і лысіна», «Карова і вершы» і інш.

Акрамя творчых сустрэч на базе Цэнтра славянскіх моў і культур пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры літаратуры Любові Якаўлеўны Глазман і Вольгі Фёдараўны Сяньковай ладзіцца адно з самых душэўных мерапрыемстваў універсітэта – «Кіно па-польску». Кінавечары праходзяць па серадах і ўжо знайшлі сваіх шматлікіх прыхільнікаў. Па словах Вольгі Фёдараўны, галоўнае ў дзейнасці цэнтра – інтэрактыўны характар працы студэнтаў і выкладчыкаў, праяўленне ініцыятывы і крэатыўнасці з боку маладых філолагаў.

«Калі вывучаеш мову, вельмі важна разумець культурны кантэкст, у якім яна праяўляецца. Таму выкладчыкі і студэнты вырашылі, што цікавым будзе разам пазнаёміцца з польскім кінематографам, – распавяла Вольга Фёдараўна. – На кінасустрэчах мы глядзім сучасныя фільмы, пасля абмяркоўваем праблемы, закранутыя ў іх, і паралельна вывучаем польскія словы і выразы. Лічу, што самае цікавае – вучыць мову ў дзеянні, праз актыўнае ўспрыманне і выкарыстанне. Цэнтр славянскіх моў і культур дае ўсе магчымасці для гэтага: глядзець цудоўнае кіно, а затым абмяркоўваць яго разам. Да нас прыходзяць таленавітыя студэнты, з якімі мы нevерагодна цікава і карысна праводзім час».

**Юлія ПРЫШЧЭПА,**
**студэнтка 4 курса ФлФ.**